**ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ**, графічныя адзінкі, якая афармляюць сказ і паказваюць на яго граматычныя, сэнсавыя і інтанацыйныя асаблівасці.

Сістэма знакаў прыпынку, якія ўжываюцца ў сучаснай беларускай мове, складаецца з дзесяці графічных адзінак: кропкі, пытальніка, клічніка, шматкроп'я, коскі, кропкі з коскай, двукроп'я, працяжніка, дужак і двукосся. Некаторыя з гэтых знакаў прыпынку спалучаюцца і ўтвараюць састаўныя знакі прыпынку, якімі з'яўляюцца коска з працяжнікам [, –], пытальнік з клічнікам [?!], пытальнік са шматкроп'ем [?..], клічнік са шматкроп'ем [!..], пытальнік і клічнік са шматкроп'ем [?!.].

Паводле функцыі, якую выконваюць знакі прыпынку ў сказе, у лінгвістычнай літаратуры яны падзяляюцца на раздзяляльныя, выдзяляльныя і поліфункцыянальныя.

**Раздзяляльныя** (*кропка*, *пытальнік*, *клічнік*, *шматкроп'е*, *двукроп'е*, *кропка з коскай*) знакі прыпынку – графічныя адзінкі, якія служаць для аддзялення самастойных сказаў у межах абзаца, прэдыкатыўных частак складанага сказа: *Неба сінела па-веснавому чыста.* (І. Мележ); *Куды адплываюць аблокі ў задуме, знямозе?* (М. Танк); *Ужо снедаць час, і поўдзень скора, ды з гэтым бацькам адно гора!* (Якуб Колас); *...І гіне раса...* (А. Сыс); *Збожжа трэплюць: водзяць па ім малатарныя колы* (У. Караткевіч); *Непатрэбнае ўчора, назаўтра патрэбным здаецца; неабходнае сёння губляе свой кошт неўзабаве; так букеты святочныя ператвараюцца ў смецце; а насенне чакае ў зямлі, спадзяецца на травень* (А. Глобус);

**Выдзяляльныя**, або *парныя* (дужкі, двукоссе) знакі прыпынку – графічныя адзінкі, якія служаць для выдзялення са структуры сказа асобных яго частак (адасобленых членаў, параўнальных зваротаў, звароткаў, пабочных і ўстаўных канструкцый, простай мовы), што маюць дадатковае значэнне ў раскрыцці асноўнай думкі: *Якраз здалося яму* (*ці можа гэта і сапраўды было*), *раённы начальнік вельмі нешта прыглядацца пачаў на Галену* (Кузьма Чорны); *"Эх, вы! Чаго расшумеліся!" – прамовіў пісар і ўсміхнуўся* (Якуб Колас);

**Поліфункцыянальныя** знакі прыпынку – графічныя адзінкі, якія ў залежнасці ад умоў іх выкарыстання могуць выконваць функцыі і раздзяляльных, і выдзяляльных знакаў: *працяжнік*, *коска*: *Мы табой ганарымся – і плачам* (У. Караткевіч); *Здалёк відна зямля бацькоў, матуль, дзе песня б'ецца перапёлкай шэрай* (Р. Барадулін); *Усе свае пачуцці – нават самыя радасныя – ён выяўляў праз слёзы* (Змітрок Бядуля); *Мы, узбуджаныя ад хвалявання, не маглі спакойна гаварыць* (Я. Брыль); *Дзяўчаты, нібы русалкі, карагоды водзяць* (П. Панчанка).

Акрамя гэтага, знакі прыпынку могуць выкарыстоўвацца і з іншай мэтай. Працяжнік можа паказваць на спалучэнне слоў, якія служаць для абазначэння прасторы, часу або колькасці (тут ён замяняе словы "*ад – да*"): *Цягнік Мінск – Сімферопаль*; *расклад руху паяздоў на май – жнівень*. *Кран грузападымальнасцю пяць – восем тон*. Працяжнік можа паказваць на спалучэнне ўласных імёнаў, якім называецца вучэнне, закон, навучальная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўстанова (т. зв. спалучальны працяжнік): *закон Бойля – Марыёта, Ламаносава – Лавуазье*.

Пры раздзяленні ці выдзяленні слоў, сказаў розныя знакі прыпынку могуць спалучацца. Пры збегу знакаў прыпынку ў адных выпадках ўжываюцца абодва знакі, у іншых – толькі адзін з іх. Сумяшчаюцца, утвараючы *спалучэнне знакаў прыпынку*, коска з працяжнікам, а таксама пытальнік, клічнік, кропка, шматкроп'е з працяжнікам: *Дзень добры, інтэрнат, – стары знаёмы, Вясёлая студэнцкая зямля* (Р. Барадулін); *Я буду жыць! – бо я мужык* (Янка Купала); *Вецер пракоціцца, будзячы нівы, – нівы калоссем шумяць* (Якуб Колас); *Хто гаварыў і каму? – ён ніяк не мог успомніць* (І. Шамякін); Калі пасля працяжніка стаяць пабочныя словы ці сказ, то першая коска апускаецца: *Для нас і гэтае возера – як кажуць, – цэлае мора* (М. Ткачоў).

Коска, кропка з коскай, двукроп'е і працяжнік ставяцца толькі пасля дужак: *Мы, прабачце* (*проста сорамна гаварыць*), *не змаглі перабрацца за раку* (С. Баранавых); *Сцёпка падняўся на ногі, закінуў за плечы торбачку* (*а яна ўжо палягчэла трохі*), *выйшаў на чыгунку і патрапаў уздоўж яе па вузенькай бясконцай сцежачцы* (Якуб Колас); Унутры дужак ставяцца пытальнік, клічнік і шматкроп'е: *У кошыку было шмат маладых баравікоў –* (*больш за сто!*) (В. Каваль).

Паводле рэгламентаванасці ці нерэгламентаванасці (падпарадкаванасці ці непадпарадкаванасці ўстаноўленым правілам) адрозніваюцца таксама нарматыўныя, варыянтныя, факультатыўныя і аўтарскія знакі прыпынку. Нарматыўныя, варыянтныя і факультатыўныя знакі прыпынку адлюстроўваюць рэгламентаваную пунктуацыю беларускай мовы, нерэгламентаваную пунктуацыю адлюстроўваюць аўтарскія знакі прыпынку.

**Нарматыўны** знак прыпынку (ад. лац. norma – мера) – гэта разнавіднасць знака прыпынку, які абавязкова рэгулюецца пунктуацыйным правілам (пунктуацыйная нормай). Так, напрыклад, нарматыўнай з'яўляецца пастаноўка коскі паміж аднароднымі членамі сказа, працяжніка паміж галоўнымі членамі сказа, якія выражаны назоўнікамі ў назоўным склоне, двукроп'я і працяжніка пры аднародных членах сказа з абагульняльным словам, коскі пры адасобленай акалічнасці, выражанай дзеепрыслоўным зваротам, і многае іншае: *Размяклы, працяты вадою снег гурбінамі папоўз з саламяных стрэх, трывожным шэптам парушаючы цішыню…* (Я. Колас). *Птушынае царства – Пціч* (Р. Барадулін); *Хлынула ўсё разам: вада, грымоты* (І. Пташнікаў); *Бальшак і лес – усё спавіта Душнаю зялёнаю смугой…* (А. Вялюгін); *Полем, лесам, пералескамі, па зямлі, вясной абуджанай, красавік ідзе з пралескамі па праталінах і лужынах* (С. Шушкевіч).

**Варыянтны** знак прыпынку (ад лац. varians, variantis – які змяняецца) – гэта разнавіднасць знака прыпынку, які можа замяняцца іншым, але таксама рэгулюецца пунктуацыйным правілам. Пастаноўка такіх пунктуацыйных знакаў адлюстроўвае патэнцыяльныя магчымасці рознага асэнсавання і пабудовы сінтаксічнай канструкцыі. Варыянтныя знакі прыпынку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сустракаюцца ў складаных бяззлучнікавых сказах з прычынна-выніковымі адносінамі, дзе па-рознаму можна ўспрыняць сэнсавыя адносіны паміж часткамі: *Я чалавек паслухмяны: звычка старая салдата* (П. Панчанка); *Мароз здароваецца палка – зіма ўжо тупае старая* (Р. Барадулін); *А лес маўчыць – яму, без мовы, як называць вясну вясной?* (А. Куляшоў). Варыянтнасць можа сустракацца ў пунктуацыйным афармленні сказаў з адасобленымі развітымі прыдаткамі, сказаў з устаўнымі канструкцыямі. Параўн.: *Ціха дрэвы штось гутораць, веку выхаванцы* (Я. Колас) і *Стаю і з пачуццём неўтаймаваным гляджу на след блакітны за кармой, як быццам я плыву не акіянам, а Бесяддзю – жаданаю ракой* (А. Куляшоў); *Печнікі, Валуй з Парэпкам – яны адна складалі на вёсцы печы, пліты і грубкі – былі людзьмі з выдумкай* (А. Кажадуб) і *Глінішчы (мы гэта ведалі) былі за балотам* (Б. Сачанка). Варыянтам лічыцца пастаноўка пытальніка або пастаноўка клічніка і пытальніка (адначасова) у канцы пытальна-рытарычнага сказа і пад. Параўн.: *І дзе на свеце ёсць такая, як Нёман, рэчачка другая?!* (Я. Колас) і *Дняпро ляціць у белы свет, Дунай грыміць між гор, а хіба знае хто як след між рэк раку Бабёр?* (М. Калачынскі).

**Факультатыўны** (ад лац. facultas – магчымасць) знак прыпынку – гэта разнавіднасць знака прыпынку, які можа афармляць ці не афармляць сінтаксічную канструцыю, але яго наяўнасць ці адсутнасць таксама рэгулюецца пунктуацыйным правілам. Так, напрыклад, магчымай (але неабавязковай) з’яўляецца пастаноўка працяжніка ў няпоўным (эліптычным) сказе, паколькі яна ў многім абумоўлена інтанацыяй. Параўн.: *Рыжаватая, чарнапёрая* [сойка], а *на крылах – блакіт для красы…* (П. Панчанка) і *За вокнамі позняя восень* (М. Зарэцкі). Факультатыўным з’яўляецца працяжнік паміж галоўнымі членамі сказа, дзе дзейнік выражаны асабовым займеннікам: *Мы людзі свабодныя, вольныя птахі* (Я. Купала) і *Я – акіяна жытняга калоссе…* (А. Куляшоў), а таксама коска пры асобных прыдатках, выдзяленне якіх абумоўлена наяўнасцю дадатковага акалічнаснага значэння; параўн.: *Сябра майго маленства Сяргей Цыган стаіць на крутым пясчаным пагорку* (А. Разанаў) і *Пісьменнік-псіхолаг, Колас вельмі добра разумеў чалавечыя характары* (І. Шамякін).

**Аўтарскі** знак прыпынку – гэта разнавіднасць знака прыпынку, які не рэгулюецца пунктуацыйным правілам, а яго пастаноўка звязана са стылістыкай мастацкага тэксту. Пры дапамозе іх аўтар паглыбляе эмацыянальна-сэнсавы бок выказвання. Так, напрыклад, пры непрывычным (нерэгламентаваным) выкарыстанні працяжніка, пунктуацыя становіцца выразным стылістычным сродкам: *Хто ўладарыць, той ударыць раптам – па надзеі, па душы жывой* (П. Панчанка); *А ў любасці прызнацца – кожны раз баюся…* (К. Кірэенка); *Мае браты збіраюцца разам – на святы, нарады, справы, што тычацца нас усіх* (А. Разанаў).

Амаль усе знакі прыпынку ў сучаснай беларускай мове мнагазначныя. І таму натуральна, што дзесяці простых і пяці састаўных знакаў прыпынку дастаткова для таго, каб дакладна перадаваць на пісьме сэнсавыя, граматычныя і інтанацыйныя асаблівасці любога выказвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

С.С.Мароз

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ